доўга выкрэсьлівалі зь беларускіх энцыкляпэдыяў, а Барыс Забораў апынуўся ў Парыжы.

Для дзясяткаў тысячаў нараджэнцаў Беларусі Ізраіль стаўся „новай радзімаю“. Голда Мэір, Мэнахем Бэгін, Шымон Пэрэс нарадзіліся ў Беларусі або маюць тут карані.

Што тычыць уласна *сыянізму*, дык пасьля стварэньня ізраільскае дзяржавы ён выканаў сваю гістарычную задачу і заняў належнае месца ў шэрагу шматлікіх „ізмаў“ XX стагодзьдзя.

# Сэкс

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

Ты ўжо рассталася з уборам
І ў ложка шлюбнае лягла,
Свой сорам, свой жаноцкі сорам,
Дрыжачая, перамагла.

Ды абясьсіленай душою
Ты можаш аднаго жадаць, —
Каб семя бурнае муское
У нетрах цела пахаваць.

Гэтак на пачатку стагодзьдзя ўводзіў тэму *сэксу* ў нашу літаратуру Максім Багдановіч.

А ў Савецкім Саюзе *сэксу* не было. Прынамсі, такі выгляд рабілі афіцыйныя асобы. На пачатку савецкай улады ў камсамольскіх асяродках ішлі вялікія спрэчкі. Больш адсталыя цьвердзілі, што каханьне мусіць быць „з чаромхай“, гэта значыць з заляцаньнямі і манерамі. Іншыя, перадавыя, выступалі за каханьне „без чаромхі“, свабоднае і без буржуазных цырымоніяў.

Па меры абуржуазьліваньня рэвалюцыйных элітаў тэма *сэксу* ў літаратуры пачала лічыцца непрыстойнай.

Тым часам нараджальнасьць, наяўнасьць абортаў, падпольная прастытуцыя, згвалтаваньні ды колькасьць хворых на вэнэрычныя хваробы даводзілі, што *сэкс* у жыцьці краіны ёсьць. Іншая справа: які...

Само слова „*сэкс*“ прыйшло ў нашу мову хіба ў апошняй чвэртцы XX стагодзьдзя. Раней ужываныя: полавы акт, полавыя зносіны, злучэньне, сусполеньне, а таксама вулічныя жарганізмы перайшлі ў шэрагі сынонімаў. Спарка, параваньне, злучка, аплодненьне сталі абазначаць *сэкс* у жывёлаў.

У 60-х *сэкс* у літаратуру вярнуў Уладзімер Караткевіч („Леаніды ня вернуцца да зямлі“). Напрыканцы XX стагодзьдзя Рыгор Барадулін паставіў гэтай тэме і веку кропку сваім зборнікам „Здубавецьце“. А на вясельлях усё пяюць:

Гарманіст, гарманіст,
Пакладзі мяне пад ніз,
А я ўстану пагляджу,
А ці добра я ляжу.

Свабода пісаць і гаварыць пра *сэкс* прыйшла з развалам камуністычнай сыстэмы. Цяпер усе прызнаюць: *сэкс* у нас ёсьць! Як той казаў: і за гэта дзякуй.